# ВЕРШЫКІ-ЗАГАДКІ

ад
Алены Церашковай

Малюнкі Юліі Малахоўскай

# Сшытак 1

© 2010 "Нашыя дзеткі", http://dzietki.org/

Я на клямачцы вішу -
Не кусаю, не брашу.
Не пушчу чужых у госці,
Не прашу за гэта косці...
Здагадацца ты ўжо мог,
Што размова пра





Ён у вашага замка
Нібы правая рука.
Далікатна, небалюча
Адмыкае дзверы





*Адгадай загадкі.*
*Абвядзі абрысы па кропках і расфарбуй малюнкі.*
*Які ключык адчыніць замок?*

© 2010 "Нашыя дзеткі", http://dzietki.org/

*Адгадай загадкі.*
*Абвядзі абрысы па кропках і*
*расфарбуй малюнак.*

Я крычу ўсё часцей:
Гаспадар, прымай гасцей!
Шчабятаць магу як птушка
Ці мычэць нібы цялушка,
Ды за звонкі галасок
Клічаце мяне -



Я любога прыпыняю,
Падаваць руку змушаю.
Маю вочка і званок,
Маю моцны я замок.
Толькі вартаму даверу
Гаспадар адчыніць





Расцягнуўся ён пры дзверы
(Стаў сурвэткай дзеля ног),
Не прапусціць у кватэру
Бруд прыгожы

*Дамалюй сіметрычна правую*
*частку дыванка.*

© 2010 “Нашыя дзеткі”, http://dzietki.org/

Каляровыя браткі
Носяць з дрэва кажушкі.
Мы завострым ім галоўкі,
Каб маглі пісаць

*Што намаляваў аловак?*





Спрытная сястра алоўка
У руку кладзецца лоўка,
Піша ў сшытку чыста, гладка
Мая сіняя







© 2010 “Нашыя дзеткі”, http://dzietki.org/

Па талерцы на стале
Дзіўны карабель плыве:
Чарпане ваду бартом -
Сустракаецца са ртом.
Што гэта? Падумай крышку.
Здагадаўся? Гэта



Кожны дзень са зброяй гэтай
Я палюю на катлеты.
З першай спробы ў іх пацэліць
Вастразубы мой



© 2010 “Нашыя дзеткі”, http://dzietki.org/

Шарыць доўгай сквапнай лапай
Пад сталом і пад канапай,
Пыл збірае ў мяшок
Працавіты





Шафа белая жывая
Холад у сабе трымае.
Прачынаецца ўночы
І пад нос сабе буркоча:
- У мяне пастаўце ежу
Зберагу я ежу свежай,
Будзе ў вас парадак поўны,
Калі спраўная

*Якія з гэтых прадуктаў абавязкова захоўваць у лядоўні, а якія - не?*

*А што з гэтага трэба трымаць у маразільні?*




© 2010 “Нашыя дзеткі”, http://dzietki.org/

Як я з вуліцы прыйду
Вопратку туды складу,
Каб з-за бруду ды з-за плямаў
Не перажывала мама.
Вечка шчыльна прыціскаю,
Парашку дам - і ўключаю.
Хутка справіцца павінна
З брудам





*Якую вілку трэба падлучыць да разеткі?*

Бруд адмыць, вядома ж, мала.
Каб усё прыгожым стала,
Стрэлачкі на нагавіцах
І аборкі на спадніцах,
Стужкі, што ўпляцеш у косы,
І фіраначкі ў палосы
Я разгладжу, дай мне час!
Я  бабулін сябра

© 2010 “Нашыя дзеткі”, http://dzietki.org/